ДУК «Бібліятэчная сетка Хоцімскага раёна»

Дзіцячая бібліятэка-філіял

# Беларускія кнігі-юбіляры

# 2020

Віртуальная выстава

**Дарагія сябры!**
**Прапануем вам**
**пазнаёміцца з кнігамі-юбілярамі,**
**якія ў 2020 годзе святкуюць**
**свой ЮБІЛЕЙ!**

# 110 гадоў з дня выхаду зборніка «Песні жальбы» Я. Коласа (1910)

«Песні-жальбы» — першы зборнік вершаў класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа (1882–1956), у якім адлюстраваны вобраз роднага краю і рэаліі тагачаснага жыцця. Аўтар паэтызуе вобраз беларускага мужыка, які, знаходзячыся ў цяжкіх сацыяльных умовах, застаецца аптымістам і верыць у адраджэнне радзімы.



# 110 гадоў з дня выхаду зборніка «Гусляр» Я. Купалы (1910)

Зборнік «Гусляр» раскрывае духоўны свет чалавека ў яго імкненні да поўнага разняволення і свабоды ў маштабах усяго чалавецтва. Паэт узнімаецца ў шырокія прасторы духоўнасці, а ідэалы сацыяльнага вызвалення і палітычнай свабоды ў яго свядомасці арганічна аб’ядноўваюцца з ідэяй духоўнага самаўдасканалення. У «Гуслярьі» прысутнічае глабальнае адчуванне эпохі, глыбіні і маштабу яе канфліктаў і катаклізмаў. Відаць зрух у самім спосабе ўспрымання свету.



# 95 гадоў з дня выхаду зборніка «Крапіва» К. Крапівы (1925)

Зборнік сатырычных вершаў, баек, апавяданняў. Байкі, як і патрабуе гэты жанр, у К. Крапівы населены беларускімі жывёламі і птушкамі (свіннямі, парсюкамі, валамі і г.д.), бічуюць адсталыя людскія звычаі: п’янства, забабоны, пляткарства, асуджаюць бюракратаў, раскрадальнікаў народных здабыткаў, падхалімаў.

Байкі К. Крапівы, нацыянальна-самабытныя па характары, былі народжаны надзённымі патрэбамі часу. Сатырычныя па сваім духоўным абліччы яны не страцілі сваёй актуальнасці і ў XXI стагоддзі. Яны з’явіліся ў савецкі час, але працягваюць быць і сёння дзейсным сродкам выкрыцця ўсяго таго адмоўнага, злога і нядобрага, што перашкаджае нам рухацца наперад.



# 85 гадоў з дня выхаду рамана «Трэцяе пакаленне» К. Чорнага (1935)

**У рамане «Трэцяе пакаленне» Кузьма Чорны адлюстраваў час з яго складанымі праблемамі, як сацыяльнымі, так і маральнымі. Твор паказвае класавую барацьбу ў першыя паслякастрычніцкія гады, калі кулакі, закаранелыя ўласнікі, станавіліся ў варожую пазіцыю да савецкай улады.**



# 60 гадоў з дня выхаду
# аповесці «Жураўліны крык» В. Быкава
# (1960)

«Жураўліны крык» — аповесць беларускага пісьменніка Васіля Быкава, выдадзеная ў 1959 годзе. Апавядае пра жыццёвыя гісторыі шасці чырвонаармейцаў, якія апынуліся ў старожцы на чыгуначным пераездзе, разам змагаліся, сябравалі, спрачаліся, пакутавалі, разважалі і загінулі ў баях з салдатамі Вермахта.



# 60 гадоў з дня выхаду рамана «Людзі на балоце» І. Мележа (1960)

**У рамане «Людзі на балоце» І. Мележ стварыў цэлы шэраг вобразаў, якія надоўга застаюцца ў памяці. Яны ўражваюць чытача сваёй праўдзівасцю і непаўторнасцю. Адны з іх з'яўляюцца для нас прыкладам сапраўднага кахання, другія — вучаць беражлівым адносінам да зямлі і да таго, што створана рукамі чалавека. Вельмі цікава І. Мележ апавядае нам пра ўзаемаадносіны Куранёўскай прыгажуні — Ганны Чарнушкі і працавітага хлопца — Васіля Дзятліка. Яны кахаюць адзін аднаго, але абставіны складваюцца так, што Васіль і Ганна ніколі не будуць разам.**



# 55 гадоў з дня выхаду рамана «Подых навальніцы» І. Мележа (1965)

Іван Мележ пры дапамозе апісання прыроды дапамагае нам адчуць, зразумець, спасцігнуць усю велічнасць і значнасць таго гістарычнага працэсу, які адчувалі на сабе нашы продкі. Непасрэдна свой абавязак класік беларускай літаратуры бачыў у тым, каб мастацкім словам стварыць гісторыю народа, каб даць магчымасць сучаснікам ацаніць, захапіцца духоўнымі каштоўнасцямі беларусаў. Героі «Палескай хронікі» жывуць і дзейнічаюць на ўлонні прыроды, якая фарміруе адпаведны настрой, дазваляе напаўняць прастору радасцю і адчуваннем паўнаты шчасця.



# 55 гадоў з дня выхаду рамана «Трывожнае шчасце» І. Шамякіна (1965)

«Трывожнае шчасце» — першая пенталогія ў беларускай літаратуры. Кніга, ў якую ўвайшлі пяць аповесцяў, аб'яднаных агульнымі галоўнымі героямі. Спачатку І. Шамякін планаваў напісаць адну аповесць «Непаўторная вясна», дзеянне ў якой разгортвалася ў перадваенны час. Але ў працэсе працы пісьменнік асэнсаваў абмежаванасць творчай задумкі, расшырыў рамкі твора і ў часе, і ў прасторы. У вобразах Сашы і Пятра, іх сяброў і саратнікаў аўтар увасобіў не толькі свае ўяўленні аб асабістым шчасці, аб гармоніі асабістага і грамадскага, але і адлюстраваў цэлую эпоху ў жыцці савецкага народа.



# 50 гадоў з дня выхаду рамана «Плач перепёлкі» І. Чыгрынава (1970)

Раман «Плач перапёлкі» — першая частка яго трылогіі аб Вялікай Айчыннай вайне. Падзеі ў ім разгортваюцца ў невялікай лясной вёсцы. Аўтар праўдзіва і мастацка ярка малюе пачатковыя месяцы вайны, мужнасць і стойкасць савецкага народа ў барацьбе з фашысцкімі акупантамі. За раманы «Плач перапёлкі» і «Апраўданне крыві» Іван Чыгрынаў Саюзам пісьменнікаў СССР і Галоўным палітычным кіраваннем Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флота ўзнагароджаны сярэбраным медалём імя А. А. Фадзеева.



# 50 гадоў з дня выхаду кнігі «Мы – хлопцы жывучыя» І. Сяркова (1970)

**Заканчваецца вайна. У вызваленай ад немцаў беларускай вёсцы Пакалюбічы засталіся адны жанчыны ды старыя, таму падлеткам даводзіцца працаваць нароўні з дарослымі. Хлапчукоў Саньку і Івана пастаянна цягне на подзвігі. Калі пайшлі па вёсцы чуткі, што ў лесе хаваецца нейкі ваўкалак, хлопцы вырашылі яго злавіць і гэтым праславіцца…**



# 50 гадоў з дня выхаду рамана «Мсціжы» І. Пташнікава (1970)

Героі многіх твораў І. Пташнікава найлепш адчуваюць сябе на ўлонні прыроды. Яны дзеляцца на тых, хто любіць лес, жывёл, працу на зямлі, і тых, хто адносіцца да прыроды па-спажывецку. На гэтым сутыкненні будуецца сюжэт рамана «Мсціжы». Андрэй Вялічка, галоўны герой, не ўяўляе сябе без лесу, дзе ён жыве і працуе. Вось чаму ён пастаянна канфліктуе з тымі, хто жыве па прынцыпу: «На наш век лесу хопіць»



# 50 гадоў з дня выхаду апавядання «Адзін лапаць, адзін чунь» М. Стральцова (1970)

У аповесці «Адзін лапаць, адзін чунь» аўтар раскрывае фарміраванне характару падлетка ў цяжкія пасляваенныя гады. Толькі закончылася вайна, памяць пра яе яшчэ жывая, гарачая не толькі ў людзей дарослых, але і ў дзяцей, якія гэту вайну бачылі, як і хлопчык Іванка — герой аповесці. Вачыма Іванкі мы бачым гэты пасляваенны час, калі і холадна, і галодна, ні апрануць, ні абуць няма чаго.



# 50 гадоў з дня выхаду зборніка «Снежныя грамніцы» Я. Янішчыц (1970)

Зборнік «Снежныя грамніцы» Першая кніга паэтэсы, запомнілася натуральнасцю, маладосцю, а галоўнае — непрыдуманасцю пачуццяў. У ёй неяк лёгка, прыгожа і тонка адбіўся юнацкі свет паэтэсы — ўражанні, хваляванні, мроі.



# 50 гадоў з дня выхаду аповесці «Сотнікаў» В. Быкава (1970)

«Сотнікаў» — узрушаючая ўяўленне ў сваёй амаль дакументальнай прастаце гісторыя двух партызан, якія трапілі ў палон. Гэта разважанне пра гераізм і здраду, смерць і жыццё, гісторыя пра мужнасць, гонар і вернасць абавязку.



# 45 гадоў з дня выхаду зборніка «Свята пчалы» Р. Барадуліна (1975)

«Свята пчалы» — выбраныя старонкі з асноўных кніг лірыкі Рыгора Барадуліна, пададзеныя ў храналагічным парадку.



# 35 гадоў з дня выхаду рамана «Родныя дзеці» Н. Гілевіча (1985)




**Раман у вершах «Родныя дзеці» — адзін з самых, глыбока прадуманых твораў, якому паэт аддаў дванаццаць гадоў натхнёнай і рупнай працы. Да традыцыйнай ў беларускай літаратуры тэмы бацькоў і дзяцей, сустрэчы з роднымі ў матчыным доме далучылася цэнтральная ў гэтым творы тэма кахання як духоўнай сустрэчы мужчыны і жанчыны. Спрадвечная ў сусветным мастацтве трагедыя кахання ў Гілевічавым творы набыла новы, вельмі сучасны, экзістэнцыяльны сэнс.**

# Дзякуй за ўвагу!

**Мы вас чакаем:**

**вул. Ленінская, 2а.**

**Тэлефануйце: 8 (02247) 7 88 65**